*Выводы*. Результаты деятельности нацистских захватчиков на нашей земле – поистине чудовищные. Были уничтожены целые города, деревни и села. Но как бы велик ни был материальный ущерб, самая болезненная и тяжелая потеря – гибель людей. Памятники, мемориальные комплексы, архивные фото, отрывки писем и документов – только эти немые свидетели трагического прошлого рассказывают сегодня о тысячах наших земляков, расстрелянных и сожженных. И мы обязаны оставить в своей душе место для светлой памяти о тех, кто, став пеплом, остался частью истории нашей земли.

**Литературные источники:**

1. Трагедия Хатыни [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://khatyn.by/ru/memorial/tragediya-khatyni/. – Дата доступа: 20.03.2023.

2. Шалькевич, Л. В. Слёзы Хатыни / Л. В. Шалькевич // Милиция Беларуси – 2013. –№ 2. – С. 34-39.

# ЖЫЦЦЁВЫ І ВАЕННЫ ШЛЯХ ФЁДАРА ДЗМІТРЫЕВІЧА АКСЁНАВА

**Д. І. Жусін**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
г. Гродна, Беларусь

Навуковы кіраўнік – загадчык кафедры замежных моў,
канд. філал. навук, дацэнт С. Г. Ляскевіч

Праз два гады міне ўжо восемдзесят год, як адгрымелі апошнія залпы Вялікай Айчыннай вайны. Змянілася некалькі пакаленняў, ужо вельмі мала засталося з намі тых, хто быў непасрэдным сведкам тых жорсткіх падзей. Мужнасць і гераізм, стойкасць і адвага былі праяўлены нашым народам, людзьмі ўсіх нацыянальнасцей, якія згуртаваліся ў адзіным парыве, каб абараніць сваю радзіму ад фашысцкай нечысці. Мы павінны памятаць, якім коштам дасталася перамога, шанаваць памяць тых, хто вынес усе цяжкасці ваеннага ліхалецця і далей адбудоўваў краіну, падымаў яе з папялішчаў.

Наш абавязак – захаваць памяць аб баявых і працоўных подзвігах ветэранаў той вайны, перадаць веды нашым дзецям, вучням, для таго, каб выхаваць у іх пачуццё павагі, падзякі і гонару за нашых



Репозиторий ГрГМУ

продкаў, якія выратавалі свет, абаранілі незалежнасць Радзімы. Адным з непасрэдных спосабаў захавання такой памяці бачыцца занатаванне ўспамінаў сваіх родных пра падзеі той вайны, захаванне сямейных архіваў, фотаздымкаў, баявых узнагарод, а таксама паслядоўная фіксацыя факталагічнага матэрыялу пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта такую мэту ставілі мы перад сабой падчас напісання артыкула пра жыццёвы і ваенны шлях нашага праддзядулі Аксёнава Федара Дзмітрыевіча. Асноўным шляхам збірання матэрыялу былі размовы з матуляй, расказы бабулі і дзядулі, вывучэнне афіцыйных дакументаў.



Фёдар Дзмітрыевіч нарадзіўся ў Варонежскай вобласці, Барынскі раён, у 1905 г. у беднай сялянскай сям'і. На службу не папаў, бо маці заставалася адна і яму была прадстаўлена ільгота. У 1935 г. Фёдар Дзмітрыевіч праз ваенкамат завербаваўся на Далёкі Усход і разам з сям'ёй і братам Уладзімірам прыехаў на Далёкі Усход у сяло Талстоўка. Яно здзівіла запушчанасцю, колькасцю бур'яна. Стаяла толькі некалькі дамоў. Сумна і неўтульна падалося ў чужым краі, але клопат пра сям'ю і праца адганялі сумныя думкі. Фёдар Дзмітрыевіч пайшоў працаваць у калгасную кузніцу. У 1938 г. ў Талстоўцы ваенбудаўнікі пабудавалі ветрарухавіч. Тады ў сяле яшчэ не было электрычнасці і ваду дзеля патрэб фермы дабывалі з нядраў зямлі з дапамогай вятрака. Пры лёгкім дунавенні ветрыка круціліся лопасці і прыводзілі ў рух механізмы ветрарухавіка, вада напаўняла ўсе ёмкасці. Ветрарухавік быў бачны ў акрузе на некалькі кіламетраў, з сёл Садовае, Воўкава, Тамбоўкі. Аксёнаву Фёдару і было даручана заведаваць ветраком, акрамя кузнецкай справы. Негледзячы на цяжкасці, ён любіў сваю працу і працаваў бы далей, калі б не вайна.

З 23 чэрвеня 1941 г. ў войска прызывалі ваеннаабавязаных ад 1905 па 1918 г. нараджэння ўключна. З гэтага часу былі знятыя класавыя абмежаванні і абараняць Радзіму мог кожны. Нагадаем, што ў 1925 г. ў СССР прынялі закон аб абавязковай ваеннай службе, аднак у войска забаранялася прызываць "асоб эксплуататарскіх класаў", а менавіта: дзяцей былых дваран, купцоў, афіцэраў старога войска, святароў, фабрыкантаў, а таксама казакоў і кулакоў. [1]



Рэпазіторый ГрДМУ

Тым не менш, прызыву на фронт не падлягалі пэўныя катэгорыі грамадзян, вопыт і праца якіх былі вельмі запатрабаваныя ў тыле. Так, улады «браніравалі» спецыялістаў для працы на вайсковых заводах, у прызыўную кампанію 1942 г. даваліся адтэрміноўкі камбайнерам і трактарыстам, занятым на ўборцы ўраджаю, да першай паловы 1942 г. права на адтэрміноўкі мелі і настаўнікі, якіх да 1940 г. увогуле не бралі на ваенную службу.

І Фёдара Дзмітрыевіча адправілі на фронт не адразу, а толькі ў 1942 г., пасля таго, як ён падвучыў напарніка кузнецкай справе. Год ён быў на «броні» як добры спецыяліст сваёй справы.

Прайшоў перападрыхтоўку ў Бірабіджане і быў адпраўлены на фронт. Тады яму было 37 гадоў, а ў хаце ў Фёдара засталіся жонка Марыя Іванаўна і сямёра дзяцей: Іван, Васілій, Люба, Коля, Валодзя, Сяргей і Пётар.

Пачаліся ваенныя будні: баі ішлі пад Ельцам, Даўгарукава, с. Калубеўка. 1 жніўня 1942 года Фёдар Дзмітрыевіч атрымаў сваё першае, але вельмі цяжкае раненне ў жывот. Лячыўся ў шпіталі г. Рэненбург 8 месяцаў, да сакавіка 1943 года. З хаты атрымліваў цёплыя лісты, яны грэлі душу, усялялі ўпэўненасць. Лісты пісалі ўжо падросшыя дзеці. Дачка Люба часцей за ўсіх вяла ліставанне, а ў канверт укладвала лісточкі хатняга тытуню. Калі такі ліст прыхадзіў, Фёдар Дзмітрыевіч жартаваў, што атрымліваў пасылку. Салдаты, раскурыўшы духмяны хатні тытунь, адчувалі, як быццам пабывалі ў хаце.

Пасля лячэння ён трапіў на фронт ў той самы полк. Ваяваў Фёдар пад Віцебскам каля года, затым захварэў, і лейтэнант Сіманенка адправіў яго ў Смаленск. Пасля лячэння папаў ў запасны полк, а потым зноў у сваю часць. На пачатку ваявалі ў Калузе, затым у г. Ельма ў Латвіі. Там прынялі сур'ёзны бой і зноў пад Віцебск. У 1944 г. быў паранены ў руку і нагу. Раненне было не вельмі цяжкое і Фёдар Дзмітрыевіч не пакідаў поле бою.

Цікавы, але трагічны варунак лёсу: пад час баёў пад Віцебскам ён сустрэў земляка з Таўстоўкі, Фрола Іванавіча Чэбатарова. Паспелі яны перакінуцца некалькімі словамі і пачаўся бой. Удалечы разарваўся снарад, вярнуўся Фёдар Дзмітрыевіч, і ўбачыў абезгалоўлены труп Чэбатарова. Але вайна ёсць вайна, трэба ісці ўперад…

Пайшло ўсеагульнае наступленне. З-пад Віцебска пайшлі на Оршу, Мінск, Барысаў, Бранскія лясы, Польшчу, Літву. Пад горадам Сувалкі Фёдар Дзмітрыевіч атрымаў раненне ў галаву. Асколак



Рэпазіторый ГрГМУ

з раны выдаліў сам. Сямейная гісторыя гаворыць пра тое, што сам камандзір І. Д. Чарняхоўскі дапамог зрабіць перавязку і Фёдар застаўся ў строі. Пазней такая самастойнасць і адмова ад медыцынскай дапамогі паўплывалі на здароўе: раненне дало ускладненне на вока і ў жніўні быў адпраўлены ў шпіталь у Казлы-Руда, Літва, адтуль папаў ў г. Мерыампаль. Начальнік шпіталя залічыў Фёдара ў санітарную часць, бо да страявой службы ён быў не прыгодны.

Калі рана забурцавалася, зноў накіраваўся на поле боя. Санітарная часць пайшла ў наступленне на тэрыторыю Германіі: на гарады Хайбер, Кенігсберг, Інсцінбург. Тут у маі 1945 г. Фёдар Дзмітрыевіч атрымаў вестку пра Пабеду. Шпіталь перакачаваў у Варшаву, адсюль ваенныя атрымлівалі дэмабілізацыю па ўзросце. Фёдар Дзмітрыевіч не паехаў адразу на Далёкі Усход, вельмі хацелася яму пабываць у родных мясцінах, у Ліпецкай (цяпер Варонежскай) вобласці. Наведаў усіх родных, пахадзіў роднымі сцяжынкамі.

У верасні 1945 года вярнуўся на Далёкі Усход у Талстоўку, да сям'і. Расказваў, што доўгі шлях дахаты пастаянна суправаджаўся пытаннямі ад тых, хто чакаў сваіх родных з вайны, маці і жонак: "Не бачыў на франтавых дарогах майго?...".

На шчасце, жонка і дзеці Федара Дзмітрыевіча дачакаліся і ўбачыці свайго роднага бацьку і мужа. Праўда, малодшы сын доўга не прызнаваў і называў яго "дзядзя".

Адпачываць і не думалася. Ужо на другі дзень пачаліся рабочыя дні. Сяло трэба было ўзнаўляць. Фёдар Дзмітрыевіч устанавіў механічную дойку на ферме, майстраваў маторы, клаў сушыльныя печы і зноў заведаваў ветрарухавіком.

За баявыя заслугі Фёдар Дзмітрыевіч Аксёнаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі 14 чэрвеня 1945 г., медалямі "За Победу над Германией", "За форсирование реки Березники", "За отвагу", "За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941-1945 года" і ўсімі юбілейнымі ўзнагародамі. Узнагароджаны знакамі "Воршиловский стрелок 1 степени", "Ворошиловский стрелок 2 степени". Некалькі ўзнагарод не паспеў атрымаць.


ОРДЕНОМ КРАСНОЙ ЗВЕЗДЫ

1. Рядового АКСЕНОВА Федора Дмитриевича — Санитара хирургического полевого подвижного госпиталя № 2295.

Репозиторий ГрГМУ

За пасляваенную працу Фёдар Дзмітрыевіч узнагароджаны граматамі, каштоўнымі падарункамі. Жыў ветрарухавік у сяле, пакуль быў жывы стары салдат. Да канца дзён Фёдар Дзмітрыевіч рамантаваў яго. Затым рухавік замёр і доўга яшчэ стаяў, пакуль яго не дэманціравалі.

Памёр мой прадзядуля ў 1976 годзе. Аднак памяць пра яго працягвае жыць ў яго дзецях, унуках і праўнуках. Яго ўнучка, Аксёнава Валянціна Васільеўна, свайго сына назвала ў гонар дзеда – Фёдарам. І мой артыкул – таксама ўнёсак у замацаванне памяці пра яго, пра ўсіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

**Літаратурныя крыніцы:**

1. Кого и как брали в армию с 1941 по 1945 год [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://rg.ru/2015/04/30/povestka.html – Дата доступу: 25.03.23.

## КАРАТЕЛЬНАЯ ОПЕРАЦИЯ «ЗИМНЕЕ ВОЛШЕБСТВО»

**П. А. Иванчик**

Гродненский государственный университет им. Янки Купалы,
г. Гродно, Беларусь

Научный руководитель – профессор кафедры тылового обеспечения военного факультета, канд. ист. наук, доцент В. М. Кривчиков

*Введение.* 22 марта в Беларуси отдают дань памяти жителям деревни Хатынь, которая была сожжена фашистами 22 марта 1943 г. По инициативе Генеральной прокуратуры, к 186 населенным пунктам, сожженным немецко-фашистскими захватчиками и их пособниками вместе с населением в годы оккупации и не восстановленных после войны, в «Хатынский список» добавлены еще 30 поселений. Большинство из них – 21 населенный пункт – ранее находились в Освейском (ныне Верхнедвинском) районе. Все они будут увековечены в мемориальном комплексе «Хатынь».

*Цель.* Изучить причины, ход и последствия карательной операции нацистов 1943 г. «Зимнее волшебство» в Верхнедвинском районе Витебской области.



Репозиторий ГрГМУ